# ФОТАРЭПАРТАЖ

ЧЫТАЙ, КРАІНА!

## Ад бібліятэкі РАДЗІВІЛАЎ да калекцыі Полацкага калегіума: мы пагарталі старонкі адных з самых старых друкаваных кніг у свеце

# СКАРБЫ Ў ВОКЛАДЦЫ ГІСТОРЫІ



Юлія ПАПКО
ypopko@sb.by

**15 верасня работнікі бібліятэк нашай краіны адзначаюць прафесійнае свята. Бясспрэчна, што Нацыянальная бібліятэка — захавальніца магутнага інфармацыйнага рэсурсу. Вось ужо амаль 100 гадоў яна збірае дакументальную спадчыну нашага народа. Напярэдадні свята мы наведалі самы вялікі ў краіне храм кнігі і даведаліся, з чаго ўсё пачыналася стагоддзі таму.**

Сёння ў нас больш за 7 тысяч бібліятэк, агульны фонд перавышае 180 мільёнаў экзэмпляраў. Кожны другі жыхар краіны карыстаецца паслугамі бібліятэчнага сектара. Але ў сярэдзіне мінулага тысячагоддзя ўсё было нашмат складаней — кнігі былі даступныя не многім. Адпраўляемся ў Нацыянальную бібліятэку, дзе беражліва захоўваюцца каштоўныя выданні: каля 100 тысяч рэдкіх і старадрукаваных кніг і рукапісаў, самыя раннія датуюцца XIV—XV стагоддзямі. Сярод іх збор выданняў першадрукара Францыска Скарыны — 10 кніг Бібліі, якія паклалі пачатак беларускаму кнігадрукаванню.

Задоўга да ўзнікнення публічных бібліятэк кнігі захоўваліся ў калекцыях знакамітых магнатаў і шляхціцаў, інтэлігенцыі і культурных дзеячаў. Таксама ў своеасаблівых бібліятэках навучальных і духоўных устаноў. Менавіта з такіх прыватных калекцый і пачыналася бібліятэчная справа. Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша дэманструе нам некаторыя асобныя кніжныя помнікі, якія добра захаваліся:

— Адна з самых старых друкаваных кніг у свеце датуецца XV стагоддзем. Глядзіце, тут радзівілаўскі экслібрыс — папяровая наклейка, якая сведчыць аб уладальніку кнігі. Выданне свецкага характару — гэта даведнік пра расліны, якія выкарыстоўвалі для лячэння.

Алесь Суша надзявае пальчаткі і акуратна бярэ гэты скарб. Вокладка кнігі зроблена з дрэва, абцягнута цялячай скурай с цісненнем. Павольна перагортвае старонкі, а я іх уважліва разглядаю — вельмі прыгожа размаляваны. Заўважаю на кожнай старонцы побач з друкаваным тэкстам розныя почыркі. Бачна, што людзі чыталі, каменціравалі, да лацінскіх слоў прыпісвалі пераклад. Перада мною толькі крупінка велізарнай нясвіжскай калекцыі Радзівілаў, якая налічвала дзясяткі тысяч кніг. Алесь Суша з гонарам дадае:

— Адна з багацейшых бібліятэк свету таго часу існавала з XVI стагоддзя да Другой сусветнай вайны. Бібліятэка і архівы Радзівілаў уключаны ў рэестр дакументальных помнікаў ЮНЕСКА «Памяць свету», таму з'яўляюцца не толькі беларускім скарбам, але і сусветным.

Яшчэ адна каштоўная кніга дасталася нам дзякуючы багатай калекцыі Яўхіма Літавора Храптовіча. На жаль, амаль усю бібліятэку ў пачатку XX стагоддзя з маёнтка ў Шчорсах вывезлі ў Кіеў. У нас засталося толькі некалькі кніг.

— Адна з іх — «Гістарычныя, палітычныя і ваенныя ўспаміны пра Расію» — на французскай мове, 1772 год, — Алесь Суша плаўна пераходзіць яшчэ да адной важнай старонкі ў гісторыі бібліятэчнай справы — часу, калі сталі адкрывацца бібліятэкі для публікі.

Дарэчы, раней народ амаль не мог чытаць кнігі з прыватных калекцый. Сітуацыю змянілі манастыры і навучальныя ўстановы, якія доўгі час умоўна выконвалі ролю публічных бібліятэк. Напрыклад, бібліятэка Полацкага калегіума, дзе маглі вучыцца не толькі каталікі, але і праваслаўныя, уніяты, пратэстанты. Многія вялікія людзі там чыталі — будучыя вучоныя, святары, творчыя асобы. Кандыдат культуралогіі Алесь Суша дадае:

**Задоўга да ўзнікнення публічных бібліятэк кнігі захоўваліся ў калекцыях знакамітых магнатаў, шляхціцаў, інтэлігенцыі. Менавіта з такіх прыватных калекцый і пачыналася бібліятэчная справа**

— У фондах Нацыянальнай бібліятэкі ёсць сотні кніг адтуль. Глядзіце, гэта нешта накшталт падручніка па геаметрыі, фізіцы, архітэктуры — навуковая літаратура 1750 года. Выдадзена шыкоўна: тут і гравюры, і ўкладныя схемы.

Далей глядзім на выданне «літаратуры, непажаданай для чытання», бо ў кнізе XVII стагоддзя прысутнічаюць ерэтычныя погляды. Пасля забароненай у тыя часы літаратуры пераходзім да папулярнай — разглядаем «Словы і гаворкі» Феафана Пракаповіча, вядомага рэлігійнага дзеяча. Выданне 1760 года з бібліятэкі Гродзенскай мужчынскай гімназіі.

У завяршэнне размовы Алесь Суша паказвае вельмі габарытнае выданне. Спрабую падняць кнігу — вельмі цяжкая, важыць аж 15 кілаграмаў! Берасцейская Біблія — самая вялікая, дарагая, прыгожая і загадкавая кніга ў гісторыі кніжнай культуры нашай краіны. Выпушчана ў 1563 годзе першай друкарняй на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Усяго 1,5 тысячы старонак.

— У краіне ёсць некалькі арыгіналаў, але ўсе яны няпоўныя. Каб паказаць шырокай грамадскасці гэты каштоўны помнік, мы доўга працавалі над фундаментальным факсімільным выданнем. Гэтая ўнікальная кніга — адзіная поўная версія Берасцейскай Бібліі ў нашай краіне. На жаль, у свеце іх зусім мала.



У Нацыянальнай бібліятэцы беражліва захоўваюцца каштоўныя выданні — каля 100 тысяч рэдкіх і старадрукаваных кніг і рукапісаў.

Алесь СУША: «Факсімільнае выданне — унікальная кніга. Гэта адзіная поўная версія Берасцейскай Бібліі ў нашай краіне».



У бібліятэку штодня прыязджаюць турысты з усяго свету.



Многія кнігі з'яўляюцца не толькі беларускім скарбам, але і сусветным.



Тут бачны радзівілаўскі экслібрыс — гэта папяровая наклейка, якая сведчыць пра ўладальніка кнігі.



На кожнай старонцы побач з друкаваным тэкстам — розныя почыркі. Бачна, што людзі чыталі, каменціравалі, да лацінскіх слоў прыпісвалі пераклад.

Фота Аляксея МАЦЮШЫ



Кніга важыць аж 15 кілаграмаў!



Нацыянальная бібліятэка вось ужо амаль 100 гадоў збірае дакументальную спадчыну беларускага народа.